# Свежы погляд на актуальныя праблемы

## Прэзідэнт абмеркаваў пытанні адукацыі з рэктарам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Алегам Раманавым, сенатарам, рэктарам ПДУ, і кіраўніком сваёй Адміністрацыі Ігарам Сергеенкам учора ў Палацы Незалежнасці. Падчас размовы закранулі пытанні адукацыі, выхавання моладзі і ролі грамадскіх арганізацый у гэтых працэсах.**

«Алег Аляксандравіч, я хацеў бы з вамі некалькі дэталяў абмеркаваць. Зразумела, гэта адукацыя. З вашага пагляду, што яшчэ мы тут не дацягнулі, не зрабілі? Другая — моладзь і грамадскія арганізацыі, іх роля ў грамадстве. Як узмацніць іх ролю з улікам нядаўніх падзей, асабліва 2020 года? Хачу пачуць ваш свежы погляд на гэтыя праблемы», — агучыў кіраўнік краіны тэмы для размовы.

У інтэрв'ю з журналістамі Алег Раманаў адзначыў, што з Прэзідэнтам абмеркавалі шэраг пытанняў па развіцці адукацыі і ролю грамадскіх аб'яднанняў.

«Прэзідэнта цікавала, наколькі паспяхова рэалізоўваецца дзяржаўная палітыка ў сферы адукацыі. Я засяродзіў увагу на тэндэнцыях развіцця вышэйшай адукацыі, на тым, якія задачы сёння стаяць перад універсітэтамі і ў прыватнасці перад Полацкім дзяржаўным універсітэтам, які я ўзначальваю. Прэзідэнт задаў пытанне пра тое, якую ролю ў сучасным універсітэце іграюць маладзёжныя і іншыя аб'яднанні. Я падрабязна расказаў, як выбудавана работа, і ўнёс прапановы па ўдасканаленні гэтай дзейнасці», — сказаў рэктар ПДУ.

Па яго словах, на ўзроўні звычайнага студэнта роля аб'яднанняў выяўляецца ў дапамозе яму сацыялізавацца, засвоіць якасці, неабходныя для жыцця ў нашым грамадстве.

«Калі казаць пра ролю маладзёжных і іншых аб'яднанняў на макраўзроўні, то іх задача ў тым, каб быць адным з праваднікоў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі і ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. З іх дапамогай маладым людзям неабходна атрымаць не толькі ўяўленне аб ідэалогіі, а зрабіць яе часткай сваёй унутранай культуры», — падкрэсліў суразмоўца.

Алег Раманаў акцэнтаваў, што Прэзідэнт выказаў зацікаўленасць у тым, каб універсітэты былі культурнымі цэнтрамі, дзе адбываецца не толькі прафесійнае, але і асабовае, сацыяльнае, ідэалагічнае выхаванне маладых людзей.

**Марыя ДАДАЛКА.**